*Д. В. Герасімёнак,*
*магістрант Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў*

# МУЗЕЕФІКАЦЫЯ АРХІТЭКТУРНА-ПРЫРОДНЫХ КОМПЛЕКСАЎ ЯК АДБІТАК ДУХОЎНАГА СТАНУ ГРАМАДСТВА

Музей – связуючае звяно паміж грамадствам і спадчынай, якая яму належыць. Гэта аптымальная культурная форма, выпрацаваная чалавецтвам для адаптацыі да сучаснага жыцця і выкарыстання назапашанага сацыякультурнага вопыту. Кажучы пра фізічнае захаванне спадчыны ў штучным гісторыка-культурным асяроддзі музея, музейныя работнікі пастаянна памятаюць пра духоўнае захаванне, якое мае на ўвазе захоўванне і ўключэнне ў актуальную культуру лагічнай і пазалагічнай інфармацыі, якая змяшчаецца ў прадмеце, культурных кодаў і сэнсаў.

У музейнай практыцы рубеж ХХ–ХХІ ст. можна вызначыць як «пераходны этап», звязаны з кардынальнымі трансфармацыямі музейнай прасторы і яе сэнсаў. Стратэгіі развіцця музейнай справы ХХ ст. не толькі геаграфічна пашырылі вобласць існавання музейных форм, уключыўшы практычна ўсе краіны свету ў музейнае будаўніцтва, але і прапанавалі новыя тыпы музеяў, імкліва павялічыўшы кола магчымых аб'ектаў збіральніцкай дзейнасці, а таксама напрамкаў і форм экспазіцыйнай і адукацыйнай практыкі. Важным фактарам развіцця музейнай справы стала музеефікацыя помнікаў гісторыі, архітэктуры, прыроды [4, с. 4].

Існуюць розныя напрамкі як захавання, так і выкарыстання помнікаў гісторыі і культуры, напрыклад, як аб'ектаў спорту і турызму, месцаў пражывання чалавечай супольнасці, аднак асноўным напрамкам, найбольш глыбокім па змесце і сэнсе, з'яўляецца музеефікацыя.

«Расійская музейная энцыклапедыя» вызначае музеефікацыю як кірунак музейнай дзейнасці, які заключаецца ў пераўтварэнні гісторыка-культурных або прыродных аб'ектаў у аб'екты музейнага паказу з мэтай максімальнага захавання і выяўлення іх гісторыка-культурнай, навуковай, мастацкай каштоўнасці [3].

Музеефікацыя прадугледжвае комплекс мер па захаванні аб'екта гісторыка-культурнай спадчыны (кансервацыя, рэстаўрацыя, аднаўленне, рамонт і інш.) і яго далейшае прыстасаванне для

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

музейных мэтаў. Асабліваe значэнне і актуальнасць музеефікацыі ў нашы дні звязаны як са станам асяроддзя пражывання чалавека, так і са станам грамадства.

На сучасным этапе развіцця грамадства музеефікацыя ўсведамляецца як аптымальны шлях захавання і выкарыстання помніка. У большасці выпадкаў помнікі не адбіраюцца са свайго акружэння і не перамяшчаюцца, але ператвараюцца ў музеі непасрэдна на месцы іх існавання. Музеефікаваная спадчына звязана са сваім краем, сваім грамадствам і асяроддзем бытавання. Яго каштоўнасць нязмерна падае пры адборы і пераносе ў іншае месца, ірвуцца ўзаемасувязі, змяншаецца інфармацыйны патэнцыял. У той жа час самі помнікі з'яўляюцца асновай фарміравання культурна-гістарычнага асяроддзя рэгіёну, самаідэнтыфікацыі мясцовага соцыума. Для гэтай супольнасці музеефікацыя набывае вялікае значэнне; музеефікаваныя помнікі раскрываюць значэнне рэгіянальнай культуры ў больш шырокім маштабе. Экспазіцыі музеяў створаныя на базе музеефікаваных помнікаў гісторыі, культуры, прыроды таксама прызнаюцца важным фактарам сацыяльнай адаптацыі членаў грамадства [1, с. 389].

Сярод спосабаў захавання помнікаў гісторыі і культуры музеефікацыя лічыцца адным з самых лепшых відаў іх аховы. Толькі ў музейным выкарыстанні помнік гісторыі, архітэктуры, прыроды можа праявіць усе свае ўласцівасці, у першую чаргу свой інфармацыйны патэнцыял.

Важным фактарам развіцця працэсу музеефікацыі становіцца распачатая з канца 1950-х гг. арганізацыя музеяў-запаведнікаў. З іх стварэннем звязаны першыя спробы паказу цэлых фрагментаў гарадскога і сельскага асяроддзя як помнікаў культуры. Аднак сярод аб'ектаў музеефікацыі на гэтым этапе пераважаюць помнікі архітэктуры і горадабудаўніцтва, археалогіі, садова-паркавага мастацтва. На сучасным этапе развіцця грамадства становіцца актуальнай распрацоўка паняцця «архітэктурна-прыродны комплекс» – стварэння музеяў у сукупнасці архітэктурнага, гістарычнага і прыроднага асяроддзя [2, с. 43].

Архітэктурна-прыродны комплекс – частка музеефікаванай прасторы, у склад якой уваходзяць архітэктурныя, гістарычныя і прыродныя помнікі, значныя для захавання гісторыка-культурнай і прыроднай спадчыны краіны або рэгіёну. Унутры групы вылучаюцца музеі пад адкрытым небам (у тым ліку і музеі-запаведнікі), палацы-музеі, музеі-сядзібы, дамы-музеі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Як адбітак духоўнага стану грамадства архітэктурна-прыродныя комплексы могуць адыгрываць вялікую ролю ў станаўленні асобы, забяспечваць устойлівую жыццядзейнасць соцыума, захаванне нацыянальнай культуры і традыцый, стаць важным фактарам кансалідацыі грамадства. Выкарыстанне архітэктурна-прыродных комплексаў у такім напрамку дазволіць выпрацаваць меры па рашэнні дадзеных праблем, умацаваць духоўныя асновы функцыянавання грамадства.

Такім чынам, музеефікацыя з'яўляецца важным напрамкам музейнай дзейнасці, а архітэктурна-прыродны комплекс – вельмі дзейсны сродак асваення асяроддзя пражывання чалавечай супольнасці, фактар стабілізацыі яе якасцяў, інструмент вырашэння многіх важных сацыяльных праблем. У цяперашні час развіццё такіх музеяў можа паспрыяць вырашэнню праблем сацыяльнай адаптацыі, функцыянавання грамадства, фарміравання яго духоўнага стану. Вывучэнне працэсу музеефікацыі архітэктурна-прыродных комплексаў нашай краіны з'яўляецца адным з неабходных крокаў у дадзеным накірунку.


1. *Каулен, М. Е.* Музеефикация историко-культурного наследия России / М. Е. Каулен. – М. : Этерна, 2012. – 432 с.

2. *Каулен, М. Е.* Музеефикация как одно из основных направлений музейной деятельности / М. Е. Каулен // Экологические проблемы развития музеев-заповедников. – М., 2008. – С. 35–50.

3. Музеефикация // Российская музейная энциклопедия [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.museum.ru/rme/rme.htm. – Дата доступа: 25.04.2014.

4. *Сапанжа, О. С.* Теория музея и музейности: историографический обзор и историческая типология / О. С. Сапанжа. – СПб. : Экспресс, 2011. – 98 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ